І.Б. Лапцёнак,
прарэктар па вучэбнай рабоце ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кандыдат філалагічных навук

# Тэксталогія як дысцыпліна і вобласць практычнай дзейнасці

Тэксталогія (ад лац. textum — сувязь слоў і стар.-грэч. λόγος — вучэнне) — дысцыпліна, якая вывучае і ўзнаўляе гісторыю і лёс твораў пісьменнасці і літаратуры з мэтай далейшага даследавання, інтэрпрэтацыі, публікацыі і інш.

Тэксталогія развівалася першапачаткова на аснове вывучэння рукапіснай традыцыі антычных аўтараў. Пазней стала прымяняцца да тэкстаў твораў новай і навейшай літаратуры. Паступова з прыкладной дысцыпліны тэксталогія «ператварылася ў базавую навуковую галіну, развіццё якой працякае ў адзіным рэчышчы з агульнагістарычнымі і культурнымі зменамі» [9].

Як навука тэксталогія ўзаемадзейнічае з рознымі абласцямі гуманітарных ведаў, сярод якіх яна — адна з найбольш дакладных, паколькі прадугледжвае поўнае выяўленне і апісанне сутнасці аб’екта. Тэксталогія цесна звязана з гісторыяграфіяй, палеаграфіяй, бібліяграфіяй, герменеўтыкай, архівазнаўствам, крыніцазнаўствам.

*У прадмет* тэксталогіі ўваходзіць непасрэдная праца з тэкстам. *Аб’ект* вывучэння — літаратурныя помнікі і творы вуснай народнай творчасці, у тым ліку, якія дайшлі да нас у нязначных фрагментах, падвергліся скажэнням, пераробкам і перапрацоўкам; якія з’яўляюцца зводам твораў, складаліся на працягу некалькіх стагоддзяў; захаваліся ў шматлікіх рэдакцыях, у тым ліку не надрукаваныя пры жыцці аўтара; якія не маюць аўтарства.

Метадалагічная сутнасць працэсаў тэксталагічнай падрыхтоўкі твораў класічнай літаратуры заключаецца не толькі ў выяўленні навукова вывераных тэкстаў у выданнях розных відаў і тыпаў, але і ў фарміраванні «поўнага зводу гэтых твораў на аснове навуковай, гісторыка-літаратурнай ацэнкі як саміх гэтых твораў, гісторыі іх стварэння, выдання або публікацыі, так і вызначэння іх месца і значэння ў творчасці пісьменнікаў-класікаў, літаратуры і культуры нацыі» [8].

Тэксталогія распрацоўвае прынцыпы і метадыку ўстанаўлення асноўнага тэксту, праверкі яго па першакрыніцах, арганізацыі і каменціравання.

Сваім узнікненнем тэксталогія абавязана неабходнасці вырашэння канкрэтных практычных *задач*: падрыхтоўцы да публікацыі твораў вуснай народнай творчасці і літаратурных твораў.

Разам з тым, сёння задачай тэксталогіі з’яўляецца не толькі выданне тэксту, але і апісанне яго ўнутраных уласцівасцей, высвятленне яго месца ў сацыяльным кантэксце. Асноўныя праблемы тэксталагічнага даследавання звязаны з працэсамі паслядоўнай змены выданняў, якія адлюстроўваюць спадчыну аўтара, сэнсам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і зместам твораў як гістарычных форм выяўлення кантэксту грамадскай свядомасці, з'яў культуры (навукі, мастацтва, светапогляду, ідэалогіі) і адносін грамадства да іх [5, с. 104]. Таму аб'ектам тэксталагічнага вывучэння выступаюць, акрамя самога тэксту, творчы шлях аўтара, гісторыя напісання твора, яго роля і значэнне ў нацыянальнай культуры.

Як у любой творчай дзейнасці, вынікі працы пісьменніка шмат у чым залежаць ад знешніх абставін, якія суправаджаюць і па-свойму прадвызначаюць лёс твора. Так, творы адных пісьменнікаў, апублікаваныя ў свой час, шматразова перавыдаюцца і ўваходзяць у шэраг «прызнаных дасягненняў» літаратуры, другіх не перавыдаюцца па розных прычынах, у тым ліку з-за таго, што яны малавядомыя. Гэта адносіцца да некаторых твораў нацыянальнай літаратуры, даступнай толькі ў перакладах, і сусветнай літаратуры, якія папулярызуюцца ў перакладах іншаземных аўтараў.

Атрымаўшы ў бібліятэцы ці кнігарні іншакраіннае рускамоўнае выданне, амаль ніхто не ўспрымае яго як «адзін з варыянтаў». У той жа час айчынная перакладная літаратура нярэдка мае па некалькі выдатных узораў сусветнай класікі. Пры гэтым, «якасна нашы пераклады, безумоўна, не саступаюць перакладам іншых народаў, а некаторыя зроблены на ўзроўні найвышэйшых дасягненняў гэтага віду творчасці наогул» [6, с. 3—4]. Таму адно з прызначэнняў тэксталогіі — *імкненне да аб'ектыўнасці і стабільнасці выданняў* адметных твораў літаратуры.

З такім найважнейшым прыкладным прымяненнем тэксталогіі, як выданне тэксту літаратурнага твора, звязаны разгляд наступных пытанняў: адбор твораў, іх размяшчэнне, фарміраванне даведачнага апарата (суправаджальныя артыкулы, каментарыі, паказальнікі). Рашэнне гэтых пытанняў залежыць ад тыпу выдання, абумоўленага яго прызначэннем.

Так, акадэмічнае выданне характарызуецца: дакладнасцю навукова ўстаноўленага тэксту; паўнатой складу і поўным зборам рэдакцый і варыянтаў; навуковым каментарыем, які абагульняе вынікі даследавання тэкстаў і змяшчае звесткі пра крыніцы; наяўнасцю рэдакцый, абгрунтавання выбару тэксту, атрыбуцыі, датавання; навукова-даведачным апаратам, які забяспечвае зручнае карыстанне выданнем для навуковай працы.

У навукова-папулярных выданнях размяшчаюць тэксты, устаноўленыя навукова, але са змяненнем складу і размяшчэння матэрыялу. У апараце выдання толькі ў мінімальнай ступені знаходзіць адлюстраванне навукова-даследчая праца, пераважнае развіццё атрымліваюць іншыя віды каментарыя, напрыклад, гісторыка-літаратурны. Сёння, як правіла, ні адно навуковае і навукова-папулярнае выданне твораў класікаў не абыходзіцца без тэксталагічнага каментарыя. Яго напісанню павінна папярэднічаць *тэксталагічная пашпартызацыя аб'екта*.

Вывучэнне дзейнасці пісьменніка, яго творчага шляху, месца літаратурнай спадчыны ў айчыннай і сусветнай культуры прадвызначае неабходнасць спалучэння пры падрыхтоўцы навукова выверанных тэкстаў розных *методык*: гісторыка-





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супастаўляльнага аналізу (заснаваную на канцэпцыі творчай індывідуальнасці, распрацаваную ў працах Б. Бурсава, А. Еўлахова, П. Сакуліна, М. Храпчанкі, і канцэпцыі аўтара, сфармуляваную ў працах М. Бахціна, В. Вінаградава, Б. Кормана) і тэксталагічнага аналізу.

Тэксталагічная пашпартызацыя твора пачынаецца з гісторыі публікацый. Трэба ўлічваць, што «літаратурны твор не паяўляецца адразу ў канчатковым выглядзе, а праходзіць праз стадыю чарнавых накідаў, рэдакцый, пераробак і г.д.» [10, 76]. Гісторыя тэксту прадстаўлена варыянтамі, якія адлюстроўваюць працэс працы пісьменніка над задумай твора, а стадыі гісторыі іх падрыхтоўкі звязаны з агульнымі заканамернасцямі псіхалогіі творчасці. Вывучэнне матэрыялаў гісторыі стварэння тэксту ўводзіць нас у творчую лабараторыю пісьменніка, прыадчыняе таямніцу нараджэння задумы творы. На стадыі інтэнсіўнай працы пісьменніка над тэкстам ствараюцца рэдакцыі твора. Рознагалоссі ў рэдакцыях на дадзенай стадыі дазваляюць аднавіць логіку і накіраванасць творчай задумы. Наступная стадыя гісторыі тэксту — усе прыжыццёвыя публікацыі твора. Чацвёртая стадыя — усё пасмяротныя публікацыі твора; яна адлюстроўвае ступень вывучанасці аўтарскай волі гісторыкамі літаратуры.

Фальклорная тэксталогія мае сваю спецыфіку. У фальклоры няма аўтарскага тэксту і яго матэрыяльнага выяўлення ў выглядзе аўтографа, белавой аўтарызаванай копіі, прыжыццёвай публікацыі і інш. Фалькларысты выбіраюць з мноства існуючых выкананняў таго ці іншага твора адзін або некалькі варыянтаў, правяраюць яго (іх) сапраўднасць, рыхтуюць тэкст да друку, робяць каментарыі. Асаблівасць фальклорнай тэксталогіі выяўляецца ў тым, што фалькларыст выдае запісы твораў народнай творчасці, а не самі народнапаэтычныя творы.

Вывучэнне методыкі і практыкі тэксталагічнай дзейнасці мае важнае значэнне для фарміравання навыкаў работы з рознымі крыніцамі тэкстаў класічных твораў, адбору і падрыхтоўкі тэксту, аналізу іншых рэдакцый, варыянтаў, разначытанняў, працы з каментарыем, яго стварэння і вызначэння задач, складу і аб’ёму.

Разам з тым, «”тэкстолагаў наогул”, якія не з’яўляюцца адначасова спецыялістамі ў нейкай пэўнай галіне літаратуразнаўства і крыніцазнаўства, не існуе і не можа існаваць. Кожны тэкстолаг звязаны са сваім матэрыялам, над якім ён працуе, і ў пэўнай меры звязаны гэтым матэрыялам» [7, с. 5]. Веданне асноў правядзення навукова-даследчай работы па працы з тэкстам уваходзіць у склад прафесійных кампетэнцый розных спецыялістаў у адпаведнасці са спецыфікай іх дзейнасці, у тым ліку філолагаў-даследчыкаў, архівістаў, рэдактараў, метадыстаў цэнтраў народнай творчасці, бібліятэкараў, музейшчыкаў і інш.

У Інбелкульце «Тэксталогія» — вучэбная дысцыпліна, якая ўваходзіць у комплекс бібліятэказнаўчых і кнігазнаўчых дысцыплін у падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў, актуальнасць вывучэння якой абумоўлена метадалагічнай роляй тэарэтычных дысцыплін у фарміраванні прафесійнага светапогляду слухачоў. Сучасны бібліятэкар-бібліёграф павінен ведаць тэорыю, методыку і арганізацыю работы па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстаноўцы дакладнага, сапраўднага аўтарскага мастацкага тэксту, валодаць методыкай і практычнымі навыкамі тэксталагічнай дзейнасці. Спецыялістам трэба ўмець прафесійна вызначаць склад аўтарскіх тэкстаў, ведаць праблемы датыроўкі, метады атрыбуцыі і г.д. Сфарміраваныя ўменні неабходны для наступнай паспяховай працы, засваення паняццяў у сферы прафесійнай кампетэнцыі бібліятэкара, павышэння ўзроўню бібліятэчнага абслугоўвання.

У ходзе вывучэння дысцыпліны асноўныя веды дапаўняюцца пашырэннем дыяпазону асэнсавання гісторыі твора, што дазваляе больш поўна і дакладна прадставіць гісторыка-літаратурны працэс і індывідуальныя асаблівасці творчай дзейнасці аўтара. Менавіта таму ў праграму ўключаны разгляд пытанняў, звязаных з прыродай мастацкай творчасці, вывучэннем іерархіі фактараў, якія ўплываюць на працу пісьменніка.

У спектр задач дысцыпліны ўваходзяць наступныя: даць слухачам веды ў галіне гісторыі і тэорыі тэксталогіі; сфарміраваць уяўленне аб асноўных прыёмах працы з крыніцамі тэксту; прадставіць навукова-абгрунтаваны падыход да выдання літаратурнай спадчыны; паказаць методыку і арганізацыю працы ў працэсе падрыхтоўкі да публікацыі твораў класікаў мастацкай літаратуры, у тым ліку перакладаў; выпрацаваць навыкі тэксталагічнай працы ў кнігазнаўчай дзейнасці.

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу дысцыпліны вызначаны адукацыйным стандартам Рэспублікі Беларусь перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю для спецыяльнасці 1-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», кваліфікацыя «бібліятэкар-бібліёграф».

У выніку асваення дысцыпліны слухач павінен:

ведаць: месца тэксталогіі ў шэрагу філалагічных, гістарычных, літаратуразнаўчых, кнігазнаўчых дысцыплін, значэнне тэксталогіі ў кнігазнаўчай дзейнасці; асноўны паняційны апарат дысцыпліны; прызначэнне, змест і асноўныя этапы фарміравання беларускай і сусветнай тэксталогіі; эвалюцыю пісьменніка ў працэсе творчасці; асноўныя падыходы, якія выкарыстоўваюцца для аўтарызацыі тэксту; метады і прыёмы ўстанаўлення асноўнага тэксту класічнага твора, аднаўлення гісторыі яго напісання і публікацыі;

умець: прымяняць практычныя навыкі навукова-абгрунтаванага падыходу да выдання літаратурнай спадчыны; выкарыстоўваць асноўныя прыёмы працы з крыніцамі тэксту, выбару тэксту, іншых рэдакцый, варыянтаў, вызначэння задач каментарыя, яго зместу і аб'ёму;

валодаць: методыкай тэксталагічнай працы над выданнем; асноватворнымі прыёмамі бібліяграфічнага і аўтаматызаванага пошуку інфармацыі, навыкамі атрыбуцыі, датавання, каменціравання; асновамі практычнага прымянення атрыманых ведаў пры вырашэнні прафесійных задач.

У працэсе вывучэння дысцыпліны асабліва важным лічыцца *выкарыстанне нацыянальнага кампанента*: веданне беларускай тэксталогіі [1; 4], у тым ліку, традыцый, закладзеных Ф. Скарынам, В. Цяпінскім, Я. Карскім, адметнасці дзейнасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», асноўных падыходаў пры стварэнні серыі «Беларускія песняры», спецыфікі і значэння дзейнасці І. Замоціна, А. Вазнясенскага, М. Піятуховіча ў развіцці беларускай тэксталогіі, асаблівасцей стварэння шматтомных выданняў спадчыны класікаў беларускай літаратуры М. Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа і інш.

Развіццё сучаснай тэксталогіі павінна быць прадстаўлена ў практычным ракурсе праз асвятленне дзейнасці вядомых беларускіх тэкстолагаў, аўтарскіх калектываў, раскрыццё значэння і ролі навукова-даследчай і збіральніцкай працы музеяў, архіваў і бібліятэк Беларусі па развіццю нацыянальнай тэксталогіі, актуалізацыю неабходнасці вывучэння фондаў беларускіх матэрыялаў у музеях, архівах і бібліятэках замежжа.

У структуру дысцыпліны «Тэксталогія», акрамя лекцыйных, уваходзяць практычныя заняткі па фарміраванню ўменняў і навыкаў сучаснай тэксталагічнай працы над выданнямі.

Пры выкананні практычных заданняў слухачы павінны навучыцца даваць тыпалагічныя характарыстыкі выданняў класічнай літаратуры, як: мэтавае прызначэнне (адмысловае навуковае даследаванне творчасці аўтара ў цэлым, часткі творчасці, асобнага твора; папулярызацыя творчасці пісьменніка); чытацкі адрас (спецыялісты, прафесійна занятыя вывучэннем літаратуры або творчасці дадзенага аўтара; чытачы, па сваёй прафесійнай дзейнасці блізкія да літаратуразнаўчай навукі, масавы чытач).

Разгледзеўшы і апісаўшы крытэрыі тыпу выданняў класічных твораў, слухач павінен умець на яго аснове ахарактарызаваць выданні: навуковага тыпу, такія яго формы, як «энцыклапедыя творчасці» і «энцыклапедыя твора», вылучыўшы іх па крытэрыю гісторыка-культурнай характарыстыкі творчасці аўтара ў цэлым або асобнага твора; «навуковыя выданні», якія змяшчаюць літаратуразнаўчую характарыстыку творчасці пісьменніка ў цэлым, часткі творчасці, асобнага твора; навуковамасавага тыпу, задача якіх — папулярызацыя навуковай ацэнкі творчасці аўтара ў цэлым, часткі творчасці, асобнага твора; масавага тыпу — якія выпускаюцца з мэтай папулярызацыі творчасці аўтара ў цэлым, часткі творчасці або асобнага твора. У працэсе выканання практычных заданняў праводзіцца тэксталагічны аналіз твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў, перакладаў нацыянальнай літаратуры з выкарыстаннем метадычных матэрыялаў [2; 3; 6].

Праца з тэкстамі нацыянальнай літаратуры, помнікамі пісьменства і вуснай народнай творчасці, што адлюстроўваюць гісторыю іх стварэння і разнастайныя кантэксты, у якіх працякаюць працэсы творчай дзейнасці, паглыбляе бачанне і прафесійны ракурс разгляду праблем, павышае эрудыраванасць і кампетэнтнасць спецыяліста, спрыяе генерацыі адносін у спажыўцоў паслуг да літаратуры і фальклору як значнай часткі нацыянальнай культуры, важнага сродку пазнання свету, што, у сваю чаргу, заклікана спрыяць папулярызацыі нацыянальнай спадчыны, фарміраванню духоўнасці грамадства і беражлівых адносін да культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Голуб, Т.* Тэксталогія беларускай літаратуры XX стагоддзя : гісторыя тэксту як шлях да гісторыі літаратуры / Т. Голуб. — Мінск : Беларуская навука, 2013. — 245 с.
2. *Голуб, Т.С.* У творчай майстэрні класіка : тэксталогія твораў М. Гарэцкага / Т.С. Голуб. — Мінск : Беларуская навука, 2002. — 157 с.
3. *Гульман, Р.І.* Тэксталогія твораў Янкі Купалы : пытанні вызначэння аўтэнтычнага тэксту / Р.І. Гульман. — Мінск : Навука і тэхніка, 1971. — 173 с.
4. *Золава, Э.А.* Тэксталогія — мая прафесія / Э.А. Золава. — Мінск, 2006.
5. *Корсакова, Ю.С.* О развитии текстологии (Электронный ресурс) / Ю.С. Корсакова // Филологические науки. Вопросы теории и практики. — Вып. №№ 7—1 (18) / 2012. — Режим доступа : http://cyberleninka.ru/article/n/o-razvitii-tekstologii. — Дата доступа : 20.06.2016.
6. *Лапцёнак (Лавар), І.* Паэт-перакладчык Я. Семяжон : адметнасць творчай індывідуальнасці / І. Лапцёнак (Лавар); навук. рэд. В.П. Рагойша. — Мінск : Беларуская навука, 2010. — 255 с.
7. *Лихачев, Д.С.* Текстология. Краткий очерк / Д.С. Лихачев. — 2-е изд. — М. : Наука, 2006. — Рэжым доступа : http://www.lihachev.ru/lihachev/bibliografiya/nauka/literatura/3946/. — Дата доступа : 20.06.2016.
8. *Омилянчук, С.П.* Текстология. Конспект лекций (Электронное издание) / С.П. Омилянчук. — Режим доступа : http://hi-edu.ru/e-books/xbook076/01/index.html. — Дата доступа : 20.06.2016.
9. *Щербакова, М.И.* Точная наука текстология / М.И. Щербакова // Проблемы филологии : язык и литература. — 2010. — № 1. — Режим доступа : psyjournals.ru/files/32836/philology_2010_1_Scherbakova.pdf. — Дата доступа : 20.06.2016.
10. *Эйхенбаум, Б.* Основы текстологии / Б. Эйхенбаум // Редактор и книга : сб. ст. — М., 1962. — Режим доступа : http://imwerden.de/pdf/eichenbaum_osnovy_tekstologii_1962_text.pdf. — Дата доступа : 20.06.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ